**Чараўко В.У.**

## ІНВЕНТАР АРХІРЭЙСКІХ ПАХАВАННЯЎ XVII–XVIII СТСТ. З ПОЛАЦКАГА САФІЙСКАГА САБОРА[1]

Пахавальны інвентар з'яўляецца каштоўнай археалагічнай і гістарычнай крыніцай. Ён дазваляе датаваць помнік, вызначыць асаблівасці пахавальнага абраду, яго залежнасць ад сацыяльных фактараў і канфесійных працэсаў, прасачыць дынаміку развіцця пахавальнай практыкі. Акрамя таго, прадметы інвентару даюць уяўленне пра развіццё рамяства і, шырэй, матэрыяльнай культуры. Пераважная большасць пахаванняў Паўночнай Беларусі XIV–XVIII стст. не ўтрымлівае інвентару. Гэта тлумачыцца іх адпаведнасцю хрысціянскаму канону, які забараняў змяшчаць разам з пахаваным бытавыя рэчы, а таксама стратамі прадметаў з арганічных матэрыялаў (адзення, абутку, галаўных убораў) у працэсе археалагізацыі [9, с. 277]. Таму ўсе даныя аб пахавальным інвентары помнікаў позняга сярэдневякоўя – ранняга новага часу заслугоўваюць пільнай увагі.

У адпаведнасці з нормамі хрысціянства, цела нябожчыка апраналі ў вопратку, якая адпавядала сацыяльнаму статусу і палажэнню памерлага пры жыцці. Падобныя правілы суадносяцца з этнаграфічна зафіксаванай у XIX–XX стст. практыкай, калі пахавальнае адзенне мала чым адрознівалася ад звычайнага святочнага [7, с. 362; 11, с. 512; 12, с. 161]. Рэшткі багатай вопраткі, упрыгажэнні і прадметы культу асабістага выкарыстання прысутнічалі ў пахаваннях XVII ст., даследаваных Т. С. Бубенька ў Дабравешчанскай царкве Віцебска [10, с. 92–93]. Адзенне з каштоўных тканін, упрыгажэнні і прадметы культу асабістага выкарыстання з'яўляліся часткай касцюма (у шырокім вызначэнні гэтага тэрміна) пахаваных у Дабравешчанскай царкве прадстаўнікоў свецкай сацыяльнай эліты – шляхты і гарадскога патрыцыяту – і рэпрэзентавала іх высокі грамадскі і маёмасны статус. Адносна добрая захаванасць тканіны можа быць патлумачана бо́льшай абароненасцю пахаванняў у храме ад неспрыяльных прыродных умоў.

Гэтай жа акалічнасцю тлумачыцца захаванасць тканіны ў пахаваннях архірэяў, выяўленых у Сафійскім саборы ў Полацку. Звесткі аб першым з іх утрымліваюцца ў «Дзённіку Полацкага Сафійскага манастыра» [1, с. 343]. «Дзённік…» («Acta monasterii Polocensis S. Sophiae…») – манастырская хроніка, якая апісвае падзеі 1745–1767 гг. і была надрукавана ў дзясятым томе «Археаграфічнага зборніка дакументаў» у 1874 г. [1; 8, с. 167].

«Дзённік…» паведамляе, што ў 1747 г. пры рамонце рабочыя знайшлі ў сцяне Сафійскага сабора грабніцу. У ёй змяшчаліся парэшткі чалавека ў архіепіскапскім убранні. Аўтар хронікі пералічвае элементы ўбрання: сакас; амафор «*і г.д.*»; туфлі з крыжамі на насках; параман з выявамі Дзевы Марыі, святога пантыфіка Аляксандра, святых Антонія, Васіля «і іншых [святых]»; крыж-*каравака* з рэліквіямі. Пахаванне, верагодна, належала полацкаму ўніяцкаму епіскапу Гедэону Бральніцкаму, які памёр у 1618 г. [1, с. 343; 3, с. 30].

Сакас, амафор і параман з'яўляюцца элементамі ўбрання, характэрнымі для праваслаўных архірэяў. У той жа час абутак з выявамі крыжа не быў уласцівы для адзення праваслаўных епіскапаў. Такія туфлі, як падкрэслівае храніст, насілі каталіцкія біскупы пры набажэнствах [1, с. 343]. Можна меркаваць, што спалучэнне ў строі пахаванага епіскапа элементаў, уласцівых убранню праваслаўных і каталіцкіх архірэяў, пры дамінаванні першых, адлюстроўвала заходнія ўплывы на ўніяцкую царкву XVII ст.

Згаданы крыж-каравака, верагодна, з'яўляўся наперсным крыжам – яшчэ адной дэталлю епіскапскіх строяў. Згодна з паведамленнем, ён утрымліваў нейкія рэліквіі, гэта значыць, з'яўляўся энкалпіёнам. Тэрмін «каравака» («caravaca») азначае шасціканцовы крыж з двума перакладзінамі, верхняя з якіх карацейшая за ніжнюю. Сваю назву крыж такой формы атрымаў ад іспанскага горада Каравака-дэ-ла-Круз, дзе захоўваўся шасціканцовы крыж-рэлікварый. Ён набыў папулярнасць у час Трыдэнцкага сабора і ў свядомасці тагачасных людзей успрымаўся як надзейная абарона ад чумы. Такі крыж-каравака з сярэдзіны XVI ст. набыў пашырэнне і ў Рэчы Паспалітай [13]. Адзначым, аднак, што шасціканцовая форма не з'яўляецца асаблівасцю выключна крыжа-каравакі: аналагічную форму меў крыж Еўфрасінні Полацкай.

Інфармацыю аб яшчэ адным архірэйскім пахаванні, выяўленым у Сафійскім саборы, прыводзіць А. П. Сапуноў. Вядомы гісторык і краязнаўца ў 1912 г. быў запрошаны праводзіць экспертызу выяўленых парэшткаў, высветліў іх прыналежнасць уніяцкаму архіепіскапу Фларыяну Грабніцкаму і пакінуў падрабязнае апісанне інвентару [6, с. 353–354]. У пахаванні Фларыяна Грабніцкага захаваліся рэшткі адзення з каштоўных тканін (амафор, сакас, чорная сутана з чырвонымі гузікамі, па́ліца), галаўныя ўборы (скуфейка і мітра), абутак (сандалі), пальчаткі, крыж-рэлікварый, а таксама два пярсцёнкі. Твар памерлага быў закрыты шаўковым платком («возду́хом»), упрыгожаным пазументам [6, с. 352–353].

[1] Работа выканана ў межах праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў «Пахавальныя помнікі Полацка XI–XVIII стст. у кантэксце развіцця сінхронных некропалей Беларускага Падзвіння: пахавальны абрад, інвентар, палеаантрапалагічная характарыстыка» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20221071 ад 06.07.2022).

Як і ўбранне Гедэона Бральніцкага, строй Фларыяна Грабніцкага дэманструе спалучэнне элементаў, уласцівых як праваслаўнаму, так і каталіцкаму архірэйскаму ўбранню. Так амафор, сакас, па́ліца, скуфейка, мітра, а таксама крыж-машчавік адносяцца да праваслаўнага архірэйскага ўбрання. Чорная сутана з чырвонымі гузікамі характэрна для строя каталіцкага епіскапата. Такое спалучэнне элементаў адлюстроўвала гістарычную спецыфіку ўніяцкай царквы. Наяўнасць сандаляў і пальчатак, якія не з'яўляюцца дэталямі менавіта архірэйскага ўбрання, адпавядала наяўнай практыцы.

Платок, які закрываў твар, адносіцца выключна да пахавальнага ўбору і ў Паўночнай Беларусі адзначаны толькі ў названым выпадку. На суседніх рускіх землях фрагменты тканіны, якой закрывалі твар, таксама сустракаюцца ў пахаваннях прадстаўнікоў вышэйшага духавенства [4, с. 283–284; 12, с. 161].

Адзначым, што ў больш раннім пахаванні Гедэона Бральніцкага адсутнічаюць рэчы, якія не адносяцца да адзення і ўбрання архірэя. У больш познім пахаванні Фларыяна Грабніцкага маюцца пярсцёнкі, якія не з'яўляюцца ні прадметам адзення, ні дэталлю архірэйскага ўбрання. Адзін з іх уяўляў сабой залаты пярсцёнак-пячатку з сердалікавай устаўкай, на якой быў выразаны герб «Астоя» і літары «F H A P» – «Florianus Hrebnicki Archiep. Polocensis» [6, с. 352–353]. Гэты пярсцёнак указваў на высокі сацыяльны статус уладальніка. Тэндэнцыя да павелічэння ў больш позні час колькасці рэчаў, з якімі хавалі прадстаўнікоў вышэйшага кліру, характэрна таксама для ўкраінскіх і земляў [2, с. 124; 5, с. 161].

Убранне полацкіх ўніяцкіх архірэяў Гедэона Бральніцкага і Фларыяна Грабніцкага адлюстроўваюць і мясцовую пахавальную практыку. Калі ў пахаваннях праваслаўных епіскапаў, даследаваных у Кіеве, сакас вядомы з пачатку XVIII ст., а параман – з сярэдзіны XVIII ст. [5, с. 161], то ў Полацку гэтыя элементы ўбрання прысутнічаюць ўжо ў пахаванні Гедэона Бральніцкага, які памёр у 1618 г.

Такім чынам, звесткі аб пахаванні Гедэона Бральніцкага з «Дзённіка Полацкага Сафійскага манастыра» і аб пахаванні Фларыяна Грабніцкага з паведамлення А. П. Сапунова ўтрымліваюць інфармацыю аб пахавальным інвентары. У абодвух выпадках ён прадстаўлены дэталямі архірэйскага ўбрання, якія адпавядаюць статусу пахаваных. Высокае грамадскае становішча пахаваных у Сафійскім саборы Полацка ўніяцкіх епіскапаў збольшага рэпрэзентуецца гэтак жа, як і ў выпадку з пахаванымі ў Дабравешчанскай царкве Віцебска прадстаўнікамі свецкай эліты – праз месца пахавання (у храме), багатую вопратку, наяўнасць упрыгажэнняў. Пры гэтым вопратка епіскапаў – архірэйскае ўбранне – адпавядае іх духоўнаму сану. Пахаванні адрозніваюцца вялікай колькасцю прадметаў пахавальнага інвентару, што вылучае іх з ліку сінхронных пахаванняў, збольшага безынвентарных. Часткова гэта тлумачыцца спрыяльнымі ўмовамі, якія існавалі ў храме для захавання рэчаў з арганічных матэрыялаў. Наменклатура рэчаў у абодвух пахаваннях таксама адрозніваецца разнастайнасцю, што нетыпова для пахавальных помнікаў Полацкага і Віцебскага ваяводстваў. Пахавальны інвентар спалучае элементы, характэрныя для праваслаўнай і для каталіцкай традыцый пры дамінаванні першых. Гэта адлюстроўвае адметнасць уніяцкай царквы і яе гістарычнага лёсу. Пры гэтым элементы ўбрання як знаходзяць паралелі на суседніх украінскіх і рускіх землях, так і адлюстроўваюць рэгіянальную спецыфіку, характэрную для Беларускага Падзвіння.


1. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Т. 10. – Вильна : В типографии О. Блюмовича, 1874. – VIII с. + 392 с.
2. Беляев, Л. А. Погребение патриарха Никона в Воскресенском Ново-Иерусалимском монастыре: исследования 2012 г. / Л. А. Беляев, М. А. Капитонова // Российская археология. – 2013. – № 4. – С. 116–125.
3. Грыгаровіч, І. І. Беларуская іерархія / І. І. Грыгаровіч. – Мінск : БелЭн, 1992. – 102 с.
4. Ёлкина, И. И. Текстиль из захоронений XVII в. в Воскресенском соборе Ново-Иерусалимского монастыря / И. И. Ёлкина // Краткие сообщения института археологии. – М., 2014. – Вып. 236. – С. 281–285.
5. Мельник, О. О. Поховальні пам'ятки Києва XVI–XVIII ст. : дис. ... канд. іст. наук : 07.00.04 – археологія / О. О. Мельнік ; Інститут археології НАН України. – Київ, 2017. – 397 с.
6. Сапунов, А. Чей прах покоится в нише полоцкого Софийского собора? (Доклад в ученой архивной комиссии) / А. Сапунов // Полоцко-Витебская старина. Издание Витебской ученой комиссии. Вып. II. – Витебск : Типолит. Насл. М. Б. Неймана, 1912. – С. 351–358.
7. Сысоў, У. М. З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск : Выш. шк., 1997. – 415 с.
8. Улащик, Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1973. – 303 с.
9. Чараўко, В. У. Інвентар пахаванняў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. (да пытання аб безынвентарнасці пахаванняў) / В. У. Чараўко // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння Л. В. Аляксеева, Віцебск, 28–29 кастрычніка 2010 г. / [рэдкал.: Г. У. Савіцкі, В. А. Шышанаў, Н. Ю. Шаркоўская]. – Мінск : Медисонт, 2012. – С. 275–280.
10. Чараўко, В. У. Характарыстыка пахаванняў ранняга новага часу ўнутры Дабравешчанскай царквы ў Віцебску / В. У. Чараўко, Т. С. Бубенька // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. артыкулаў V Міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 красавіка 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А. І. Корсак (адк. рэд.), В. У. Чараўко, У. Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – С. 91–94.
11. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. І. Ч. ІІ / П. В. Шейн. – СПб. : Типография императорской Академии наук, 1890. – XXXII с. + 708 с.
12. Шиманский, Г. И. Литургика: таинства и обряды / Г. И. Шиманский. – М. : Сретенский монастырь, 2003. – 351 с.
13. Karawaka [Electronic resource] // Zbiór artykułów związanych z małą architekturą sakralną i historią. – Mode of access : http://kapliczki.org.pl/kapliczki/Karawaka. – Date of access: 18.03.2023.